УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# СНЕЖКА ДЗМІТРЫЙ СЯМЁНАВІЧ

**ПЕРАКЛАДЧЫК, ЛІТАРАТУРНЫ КРЫТЫК, ЖУРНАЛІСТ, ЭСПЕРАНТЫСТ, МЕДЫК**

**11 (24) ВЕРАСНЯ 1903 Г. – 17 ЛЮТАГА 1957 Г.**

**ФОНД № 530**

**ВОПІС № 1**

**1896–2014 гг., коп. за [1890–1894 гг.]**

МІНСК 2023

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 530**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1 | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Д.С. СНЕЖКІ | 1-15 | 1-3 |
| 1.1 | ПУБЛІКАЦЫІ ПА ГРАМАДСКІХ ПЫТАННЯХ | 1-5 | 1 |
| 1.2 | РУКАПІСЫ І ПУБЛІКАЦЫІ ПА ПРАБЛЕМАХ МЕДЫЦЫНЫ І САНІТАРНАЙ СПРАВЫ | 6-12 | 1-2 |
| 1.3 | ПУБЛІКАЦЫІ І ВЫСТУПЛЕННІ ПА ПЫТАННЯХ КУЛЬТУРЫ, ЛІТАРАТУРЫ; АГЛЯДЫ ДРУКУ | 13-15 | 2-3 |
| 2 | ПІСЬМЫ Д.С. СНЕЖКІ | 16 | 3 |
| 3 | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Д.С. СНЕЖКІ | 17-19 | 3-4 |
| 4 | ДАКУМЕНТЫ ПРА Д.С. СНЕЖКУ | 20-23 | 4 |
| 5 | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Д.С. СНЕЖКАМ ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ | 24-27 | 4-5 |
| 6 | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 28-34 | 5-6 |

## Прадмова

**Снежка Дзмітрый Сямёнавіч** (псеўданімы Зьм. Белы, Д. Белый, крыптанімы Б., Б–ы, Д. С., З. Б., З. С., Зьм. С–ка) нарадзіўся 11 (24) верасня 1903 г. у Оршы. Бацькі – Сямён Дзям'янавіч Снежка, дробны чыноўнік паштова-тэлеграфнай канторы, і Марыя Цімафееўна Снежка (памерла, калі Дзмітрыю было 4 гады; вырас з мачыхай Марыяй Васільеўнай)[1]. Пазней сям'я пераехала ў Гомель. У 1918 г. у Гомелі ўтварыўся гурток эсперантыстаў; Дзмітрый яшчэ падлеткам рэгулярна наведваў сходы гуртка і ўрэшце дасканала авалодаў мовай эсперанта. У 1922 г. Д.С. Снежка скончыў Адзіную працоўную школу № 5 г. Менска, у 1922–1929 гг. праходзіў навучанне на медыцынскім факультэце БДУ[2]. Пасля заканчэння ўніверсітэта і да арышту 5 лютага 1936 г. працаваў санітарным медыкам (інспектарам) на розных пасадах у Менску (у 1930–1931 гг. праходзіў тэрміновую службу ў войску). У 1922 г. Д.С. Снежка ўзначаліў Менскае гарадское аб'яднанне эсперантыстаў, у лютым 1923 г. быў прызначаны ўпаўнаважаным ЦК Саюза эсперантыстаў Савецкіх краін (СЭСК) (пазней Саюз эсперантыстаў Савецкіх рэспублік – СЭСР) у БССР. Калі ў студзені 1924 г. у Менску было створана Цэнтральнае бюро Беларускай арганізацыі СЭСК, Д.С. Снежка стаў яго сакратаром. 28–29 мая 1925 г. ён удзельнічаў у I Усебеларускай канферэнцыі эсперантыстаў, пазней быў абраны намеснікам старшыні Цэнтральнага бюро Беларускай федэрацыі СЭСР. Як відны актывіст і функцыянер эсперантысцкага руху ў БССР Д.С. Снежка прычыніўся да арганізацыі шматлікіх гурткоў і курсаў па вывучэнні эсперанта, шмат займаўся перакладчыцкай і журналісцкай дзейнасцю, ліставаннем з эсперантыстамі замежжа (праз міжнародную Пралетарскую эсперанта-карэспандэнцыю). Падчас разгрому эсперантысцкага руху ў СССР быў арыштаваны 5 лютага 1936 г. і 7 мая таго ж года асуджаны да 3 гадоў ссылкі[3]. У 1939 г. Д.С. Снежка вызваліўся і пасяліўся ў г. Багародзіцку Тульскай вобласці, куды неўзабаве пераехала з Беларусі яго сям'я. У Багародзіцку займаў пасады раённага санінспектара, потым загадчыка раённага аддзела аховы здароўя. За арганізацыю падчас II Сусветнай вайны медыцынскага абслугоўвання насельніцтва ў прыфрантавых умовах і аднаўлення сістэмы аховы здароўя ў раёне па яго вызваленні ад акупантаў узнагароджаны медалямі "За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941–45 гг." і "За оборону Москвы", значком "Отличник здравоохранения". У 1944 г. быў пераведзены ў Тулу старшым абласным дзяржсанінспектарам і адначасова намеснікам загадчыка абласного аддзела аховы здароўя. У 1945 г. уступіў ва Усесаюзную камуністычную партыю (бальшавікоў). У маі 1947 г. накіраваны ў Молатаў (назва г. Перм у 1940–1957 гг.) загадчыкам абласнога аддзела аховы здароўя.

[1] Гл.: БДАМЛМ. Ф. 530. Воп. 1. Спр. 21: 1.

[2] Гл.: БДАМЛМ. Ф. 530. Воп. 1. Спр. 19: 1 адв.

[3] У фондзе Д.С. Снежкі захоўваюцца два яго фотаздымкі, зробленыя падчас ссылкі, і надрукаваная ім у гэты перыяд у калужскай газеце "Коммуна" заметка ў памяць К. Э. Цыялкоўскага (з якім Д.С. Снежка ліставаўся ў 1927–1935 гг.) – гл.: БДАМЛМ. Ф. 530. Воп. 1. Спр. 3: 3; Спр. 28: 7, 11.

У снежні 1947 г. балатаваўся ў дэпутаты Молатаўскага абласнога савета па Чэрдыньскай выбарчай акрузе № 136 (відавочна, быў абраны)[4]. З 1953 г. – галоўны ўрач санаторыя вугальшчыкаў "Усць-Качка" пад г. Молатавым (Перм'ю). Памёр 17 лютага 1957 г. ад раку. Прысуд, вынесены Д.С. Снежку ў 1936 г., быў адменены толькі 20 сакавіка 1990 г.[5].

Першыя выступленні Д.С. Снежкі ў друку прыпадаюць на часы яго навучання ў БДУ. У студэнцкім часопісе БДУ "Чырвоны сьцяг" (выдаваўся ў 1925 г.) Д.С. Снежка змясціў шэраг белетрызаваных нарысаў і замалёвак, тамсама вёў аддзел крытыкі, дзе рэгулярна выступаў з аглядамі перыядычных выданняў, зрэдку друкаваў рэцэнзіі на літаратурныя творы. Яго далейшая журналісцкая праца (да сярэдзіны 1930-х) цесна звязаная з паўсядзённай дзейнасцю ў эсперантысцкім руху Беларусі і СССР. У 1926–1927 гг. у часопісе "Беларуская работніца і сялянка" выходзіць шэраг публікацый Д.С. Снежкі, падрыхтаваных на аснове перакладу з эсперанта, рэферыравання і апрацоўкі пісьмаў у СССР работніц і прадстаўніц "левай" інтэлігенцыі шматлікіх еўрапейскіх краін і Кітая. У 1927–1928 гг. ён супрацоўнічае з літаратурнымі часопісамі "Чырвоны сейбіт", "Узвышша" і інш., публікуючы артыкулы і карэспандэнцыі на тэмы культурнага і літаратурнага жыцця замежжа. Пасля заканчэння БДУ Д.С. Снежка як журналіст амаль цалкам засяроджваецца на актуальных пытаннях і праблемах эсперантысцкага руху ў СССР / БССР, становіцца пастаянным аўтарам часопіса Цэнтральнага камітэту СЭСР "Международный язык" (Масква), дзе вядзе рубрыку "Календарь эсперкора" (сумесна з П. Кірушыным), друкуе артыкулы інструктарскага і праблемнага кшталту. Тады ж ён пачынае дасылаць свае заметкі і артыкулы на эсперанта ў шматлікія газеты і часопісы замежжа (Францыя, Фінляндыя, Германія, Швецыя, Балгарыя і інш.), дзе яны друкуюцца на мове арыгіналу ці ў перакладах на мясцовыя мовы[6]. У канцы 1920-х – сярэдзіне 1930-х гг. займаецца перакладамі літаратурных твораў з і на эсперанта; складае эсперанта-беларускі, беларуска-эсперанцкі слоўнікі і падручнік эсперанта на беларускай мове (не былі выдадзеныя); працуе над раманам "33 дакументы". Пасля трохгадовай ссылкі вяртаецца да журналісцкай дзейнасці, публікуючы артыкулы, карэспандэнцыі, заметкі па медыцынскай і санітарнай справе ў профільных агульнасаюзных выданнях ("Медицинский работник", "Гигиена и санитария") і абласной (раённай) прэсе па месцы жыхарства і працы ("За уголь", г. Багародзіцк; "Коммунар", г. Тула і інш.). Найбольш значныя журналісцкія творы Д.С. Снежкі гэтага перыяду – артыкулы "П.П. Белоусов (К 50-летию со дня смерти)" і "В.И. Смидович как санитарный врач", прысвечаныя санітарным медыкам Тулы дарэвалюцыйнага часу.

[4] Гл.: БДАМЛМ. Ф. 530. Воп. 1. Спр. 19.

[5] Біяграфічныя звесткі пра Д.С. Снежку ўзятыя (апрача згаданых архіўных матэрыялаў) з артыкула В.В. Жыбуля "Я… вяду сувязь амаль з усімі краінамі свету". Да 110-годдзя з дня нараджэння Змітра Снежкі" – Роднае слова. 2013. № 9. С. 11–14.

[6] Некаторыя з замежных выданняў, у якіх друкаваўся Д.С. Снежка ў 1920–1930-я гг., названы ў згаданым артыкуле В.В. Жыбуля (гл. с. 13).

Дакументы Д.С. Снежкі паступілі ў БДАМЛМ у 2013–2014 гг. Частка іх (рукапісы Д.С. Снежкі, яго асабістыя дакументы; газетныя выразкі з яго публікацыямі 1942–1949 гг., водгукамі на яго выступленні, згадкамі пра яго; кнігі з яго бібліятэкі, фотадакументы і інш.) была перададзена Эміліяй Дзмітрыеўнай Снежкай – малодшай дачкой фондаўтваральніка. Другая частка (ксеракопіі з беларускіх і маскоўскіх выданняў 1925–1934 гг. з публікацыямі Д.С. Снежкі і згадкамі пра яго; ксеракопія прысвечаных Д.С. Снежку фрагментаў кнігі Д.Б. Мельцэра “Белоруссия и Болгария: дружба вечная, нерушимая”; копіі эпісталярных матэрыялаў з Архіва Расійскай Акадэміі навук і інш.) паступіла ад даследчыка В.В. Жыбуля. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 34 справы (153 дакументы) за 1896–2014 гг., коп. за [1890–1894 гг.].

Вопіс складаецца з 6 раздзелаў:

У раздзеле 1 “Творчыя дакументы Д.С. Снежкі” вылучаны 3 падраздзелы адпаведна тэматыцы публікацый фондаўтваральніка; унутры падраздзелаў дакументы сістэматызаваны ў справы з улікам прыналежнасці публікацый да пэўных перыядычных выданняў. Такі прынцып сістэматызацыі абумоўлены, па-першае, спецыфікай творчых матэрыялаў Д.С. Снежкі: журналісцкія тэксты (асабліва дробных жанраў і прысвечаныя актуальным падзеям) пішуцца для канкрэтнага выдання, адпавядаюць яго рэдакцыйнай палітыцы і, у шэрагу выпадкаў, цесна звязаныя з агульным кантэкстам СМІ. Па-другое, пераважная бальшыня матэрыялаў фонду ўяўляе сабой выразкі ці ксеракопіі з канкрэтных газет / часопісаў. Сістэматызацыі папярэднічала, у неабходных выпадках, ідэнтыфікацыя выданняў і храналагічная атрыбуцыя публікацый.

У падраздзеле 1.1 “Публікацыі па грамадскіх пытаннях” на першае месца вылучаныя матэрыялы Д.С. Снежкі, прама ці ўскосна звязаныя з яго дзейнасцю ў эсперантысцкім руху (справы 1–3). Выпадковыя газетныя выступленні па грамадскіх пытаннях агульнага кшталту выдзелены ў справу 4. Выступленні ў мастацка-публіцыстычных жанрах (замалёўка, нарысы, у т. л. белетрызаваныя) пачатковага перыяду творчай дзейнасці Снежкі аб’яднаны ў справу 5.

Падраздзел 1.2 “Рукапісы і публікацыі па праблемах медыцыны і санітарнай справы” пачынаецца з матэрыялаў буйных жанраў, што захаваліся ў аўтографах і аўтарызаваным машынапісу (справы 6, 7); далей ідуць выступленні Снежкі-медыка ў агульнасаюзных спецыялізаваных і ў рэгіянальных выданнях (справы 8–11); справа 12 змяшчае выпіскі, зробленыя аўтарам падчас працы над артыкуламі медыцынскай тэматыкі.

Невялікі падраздзел 1.3 “Публікацыі і выступленні па пытаннях культуры, літаратуры; агляды друку” сістэматызаваны па жанравым прынцыпе: выступленні ў агульнажурналісцкіх жанрах (справа 13), у спецыфічных жанрах літаратурнай крытыкі (справа 14) і ў жанры дакладу (справа 15).

Раздзел 2 “Пісьмы Д.С. Снежкі” складаецца з адной справы (усе пісьмы маюць адзін адрасат).

Раздзел 3 “Дакументы да біяграфіі Д.С. Снежкі” сістэматызаваны ў адпаведнасці з храналогіяй матэрыялаў.

Раздзел 4 “Дакументы пра Д.С. Снежку” пабудаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе.

Раздзел 5 “Дакументы, сабраныя Д.С. Снежкам па цікавых для яго тэмах” змяшчае кнігі з першапачатковай хатняй бібліятэкі Снежкі, якія ацалелі пасля знішчэння яго дома ў Багародзіцку нямецкай авіяцыяй (1941); раздзел будуецца ў адпаведнасці з храналогіяй выданняў.

Раздзел 6 “Выяўленчыя дакументы” прадстаўлены фотаматэрыяламі (індывідуальныя фота Д.С. Снежкі, яго фота ў групах; фота яго сваякоў; здымак помніка на яго магіле; іншыя фота, што адкладаліся ў фондзе). Раздзел сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе.

Прадмову склаў
вядучы архівіст А.У. Адліванчык
2.06.2023

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛМ

________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1 ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Д.С. СНЕЖКІ** | | | | |
| | **1.1 ПУБЛІКАЦЫІ ПА ГРАМАДСКІХ ПЫТАННЯХ** | | | | |
| 1 | "Алло... алло... Говорит Минск", "Белорусские писатели об эсперанто" (суаўтар І. Элькінд), "Братья по классу. Помощь в борьбе и помощь в строительстве" і інш. Артыкулы, карэспандэнцыі і інш. па праблемах эсперантысцкага руху (на рускай мове і эсперанта).<br>Ксеракопіі з часопіса "Международный язык" (г. Масква) (1929-1934) і неўстаноўленага выдання [1924 - пач. 1936].<br>На Л. 18 - згадка пра Д.С. Снежку ў паведамленні "Доска почета" | | 22 | 20 | |
| 2 | "Дваццаць тры з трынаццаці краін", "Женщина в Голландии (Беседа с работницей-голландкой А. Гармсен)", "Как живут работницы Запада" і інш. Агляды пісьмаў, заметка.<br>Ксеракопіі з часопіса "Беларуская работніца і сялянка" | 1926-1927 | 8 | 8 | |
| 3 | "Neuvostoliitosta" ("З Савецкага Саюза"), "Статьи о Циолковском в иностранных журналах". Заметкі (на фінскай і рускай мовах).<br>Ксеракопія з газеты "Tyovaen Lehti" (г. Тамперэ, Фінляндыя); скан з газеты "Коммуна" (г. Калуга), выдрук | 1927, 1936 | 3 | 2 | |
| 4 | "Мои пожелания", "Мы готовы ко дню выборов". Заметкі.<br>Выразкі з газет "За уголь" (г. Багародзіцк Тульскай вобласці) і "Коммунар" (г. Тула).<br>На Л. 3 - згадка пра Д.С. Снежку ў фотахроніцы (выразка з газеты "Коммунар" (1947) | 1942-1947 | 4 | 3 | |
| 5 | "Бытавое", "Карчаваць трэба", "Праз сьмерць да жыцьця" і інш. Нарысы, замалёўка.<br>Ксеракопіі з часопіса "Чырвоны сьцяг" | 1925 | 4 | 4 | |
| | **1.2 РУКАПІСЫ І ПУБЛІКАЦЫІ ПА ПРАБЛЕМАХ МЕДЫЦЫНЫ І САНІТАРНАЙ СПРАВЫ** | | | | |
| 6 | "П.П. Белоусов (К 50-летию со дня смерти)". | 1946 | 7 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Артыкул, накід да артыкула.<br>Аўтограф, асобны друкарскі адбітак | | | | |
| 7 | "В.И. Смидович как санитарный врач". Артыкул (варыянты).<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай і рэдактарскай праўкай, асобны друкарскі адбітак | 1948 | 22 | 3 | |
| 8 | "Благоустройство Тулы", "Ближе к медицине", "Вопросы санитарной очистки Тулы" і інш. Карэспандэнцыі, заметкі, чытацкія водгукі.<br>Выразкі з газеты "Медицинский работник" (г. Масква).<br>На Л. 5 - заметка Д.С. Снежкі (выразка з газеты "Коммунар" (г. Тула) (1946) | 1943-1949 | 14 | 14 | |
| 9 | "Все на борьбу за чистоту", "За строгий санитарный порядок", "За чистоту и строгий санитарный порядок" і інш. Карэспандэнцыя, заметкі.<br>Выразкі з газеты "За уголь" (г. Багародзіцк Тульскай вобласці) | 1942-1943 | 4 | 4 | |
| 10 | "Как советская власть охраняет здоровье трудящихся", "Навести порядок в водоснабжении шахт и горняцких поселков", "Научная работа тульских врачей" і інш. Артыкулы, карэспандэнцыя, заметкі.<br>Выразкі з газеты "Коммунар" (г. Тула) | 1944-1947 | 8 | 7 | |
| 11 | "Метан в воздухе шахты Подмосковного угольного бассейна", "Первоочередные задачи". Карэспандэнцыі.<br>Выразкі з часопіса "Гигиена и санитария" (г. Масква) і газеты ["Уральская кочегарка"] (г. Кізел Молатаўскай [Пермскай] вобласці) | 1945, 1948 | 3 | 2 | |
| 12 | Выпіскі да артыкулаў "П.П. Белоусов (К 50-летию со дня смерти)" і "В.И. Смидович как санитарный врач" (з выданняў: Б лоусовъ П.П. Къ вопросу о современномъ положеніи и ближайшихъ задачахъ ассенизаціи русскихъ городовъ. Матеріалы по общественной гигіен . С.-Петербургъ, 1896; Смидовичъ В. Матеріалы для описанія г. Тулы. Санитарный и экономическій очеркъ. Тула, 1880 і інш.).<br>Рукапісы | 1946, 1948 | 28 | 3 | |
| | **1.3 ПУБЛІКАЦЫІ І ВЫСТУПЛЕННІ ПА ПЫТАННЯХ КУЛЬТУРЫ, ЛІТАРАТУРЫ; АГЛЯДЫ ДРУКУ** | | | | |
| 13 | "Вэнгэрская пролетарская літаратура", "Краеведение в БССР", "Культурнае жыцьцё Кітаю". | 1927-1928 | 4 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Артыкул, карэспандэнцыя, заметка.<br>Ксеракопіі з часопісаў "Информационный бюллетень. Издание Всесоюзного общества культсвязи с заграницей" (г. Масква) і "Чырвоны сейбіт" (г. Мінск) | | | | |
| 14 | Рэцэнзія на зборнікі С. Ясеніна "Страна советская" (Тыфліс, 1925) і "Персидские мотивы" (Масква, 1925), агляды прэсы (часопісы "Красная молодежь", "Красный студент" і інш.).<br>Ксеракопіі з часопіса "Чырвоны сьцяг" | 1925 | 2 | 6 | |
| 15 | "Образ врача в художественной литературе". Тэкст дакладу; накіды (не ўвайшлі ў канчатковы варыянт).<br>Аўтограф, машынапіс | 1950 | 45 | 2 | |
| | **2 ПІСЬМЫ Д.С. СНЕЖКІ** | | | | |
| 16 | Пісьмы Д.С. Снежкі да К.Э. Цыялкоўскага (з паметамі і накідамі адказаў К.Э. Цыялкоўскага).<br>Ксеракопіі з Архіва Расійскай акадэміі навук (Московское отд. Ф. 555. Оп. 4. Е/х 576).<br>Лл. 8-11 - выданне "Русско-международный сборник для перевода и перепечатки" (№ 1, 24 лютага<br>1919 г.); на Л. 8 памета Д.С. Снежкі | 1927-1935 | 24 | 7 | |
| | **3 ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Д.С. СНЕЖКІ** | | | | |
| 17 | Асабістыя дакументы Д.С. Снежкі (пасведчанне аб нараджэнні і хрышчэнні, пасведчанне аб заканчэнні ў 1922 г. Адзінай працоўнай школы № 5 г. Менска).<br>Друкаваныя бланкі з рукапіснымі ўстаўкамі.<br>На Л. 1 - гербавая пячатка "Могилевской духовной консисторіи"; на Л. 3 - 2 пячаткі "С.С.Р.Б. Комиссариат просвещения Минская Сов. Школа № 5"; на Л. 3 адв. - пячатка "С.С.Р.Б. Менскі Гарадзкі Выканаўчы Камітэт Р. і Ч. Д. Гарадзкі Аддзел Народ. Асьветы" | 1913, 1922 | 3 | 2 | |
| 18 | Дакументы дзейнасці Д.С. Снежкі як сакратара Беларускага цэнтральнага бюро Саюза эсперантыстаў Савецкіх краін (пісьмо Сакратарыята Беларускага цэнтральнага бюро Саюза эсперантыстаў Савецкіх краін I З'езду "Маладняка" (на беларускай мове і эсперанта), пісьмо<br>Д.С. Снежкі ў Цэнтральнае бюро "Маладняка" (з дадаткам).<br>Каляровы скан, выдрук* | 1925-1926 | 6 | 4 | |
| 19 | Улётка "Голосуйте за кандидата сталинского блока | 1947 | 2 | 1 | |

* Арыгіналы захоўваюцца: БДАМЛМ. Ф. 225. Воп. 1. Спр. 6.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | коммунистов и беспартийных Дмитрия Семеновича Снежко".<br>Друкаванае выданне з фотапартрэтам Д.С. Снежкі | | | | |
| | **4 ДАКУМЕНТЫ ПРА Д.С. СНЕЖКУ** | | | | |
| 20 | Янка Маур (И. М. Фёдоров). "Товарищ Снежко". Нарыс, з фотапартрэтам Д.С. Снежкі.<br>Баранов, Барышникова "Снежко Дмитрий Семенович у своих избирателей". Заметка.<br>В. Жыбуль "Я... вяду сувязь амаль з усімі краінамі свету". Да 110-годдзя з дня нараджэння Змітра Снежкі". Артыкул, з фотапартрэтам Д.С. Снежкі.<br>Газета "Северная коммуна" (г. Чэрдынь Молатаўскай [Пермскай] вобласці), ксеракопіі з часопісаў "Международный язык" і "Роднае слова".<br>На Л. 1 адв. - згадка пра Д.С. Снежку ў нарысе Міркора "Силуэты нашего актива" (ксеракопія з часопіса "Международный язык" (1934) | 1934-2013 | 4 | 4 | |
| 21 | Э.Д. Снежка (малодшая дачка). "Снежко Дмитрий Семенович. 1903-1957 гг." (біяграфічныя звесткі).<br>Пісьмо Э.Д. Снежкі В.В. Жыбулю са згадкамі пра бацьку.<br>Аўтографы | 2013 | 3 | 2 | |
| 22 | "Снова о полустанках" (Обзор писем, поступивших в редакцию)", "Беречь и ценить санитарные кадры" (Обзор статей, поступивших в редакцию)". Водгукі на газетныя выступленні Д.С. Снежкі.<br>Выразкі з газеты "Медицинский работник" (г. Масква) | 1945 | 2 | 2 | |
| 23 | Згадкі пра Д.С. Снежку ў друкаваных выданнях.<br>Выразкі з газет "Звезда" (г. Молатаў [Перм]), "Коммунар" (г. Тула), "Медицинский работник" (г. Масква); ксеракопіі з часопісаў "Информационный бюллетень Всесоюзного общества культсвязи с заграницей" (г. Масква), "Международный язык" (г. Масква) і інш. | 1927-2014 | 39 | 15 | |
| | **5 ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Д.С. СНЕЖКАМ ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ** | | | | |
| 24 | Александровскій Г.В. Чтенія по нов йшей русской литератур . Вып. I. Изд. [9]. Кіевъ, [1914]. Без вокладкі.<br>Друкаванае выданне.<br>Аўтограф І.А. Ганчарова.<br>Факсіміле.<br>На Л. 2 - экслібрыс Д.С. Снежкі, на Лл. 32, 43 - яго аўтографы | [1914] | 102 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 25 | Коганъ П. Очерки по исторіи нов йшей русской литературы. Т. III: Современники. Вып. I. Изд. 2. Москва, 1911. Без канчатку.<br>Друкаванае выданне.<br>На Лл. 1, 2 - аўтографы Д.С. Снежкі, на Л. 2 - яго экслібрыс | 1911 | 67 | 1 | |
| 26 | Русскій языкъ. Опытъ практическаго учебника русской грамматики. Синтаксисъ въ образцахъ (Съ приложеніемъ статьи о періодахъ). Сост.<br>К. . Петровъ. [Паміж 21 і 31 выданнямі].<br>Санктъ-Петербургъ, [1912-1918]. Без вокладкі.<br>Друкаванае выданне | [1912-1918] | 73 | 1 | |
| 27 | Учебник международного языка идо для рабочих / А. Лантош, Г. Принц, А. Эмихен, А. Фойгт; переработан Н. Юшмановым, Ф. Мильтером. Москва, [1924].<br>Друкаванае выданне.<br>На вокладцы і форзацы - экслібрысы Д.С. Снежкі | [1924] | 116 | 1 | |
| | **6 ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 28 | Фатаграфіі Д.С. Снежкі індывідуальныя.<br>Л. 10 - Марыя Яўсееўна (жонка) і Нінэль Дзмітрыеўна (старэйшая дачка) Снежкі | 1923 - [1940-я гг.] | 13 | 13 | |
| 29 | Фатаграфіі Д.С. Снежкі індывідуальныя малафарматныя | [1950-я гг.] | 1 | 1/2 | |
| 30 | Фатаграфіі Д.С. Снежкі з М.Я. Снежкай (жонкай) (на адвароце дароўны надпіс М.Я. Снежкі яе бацькам) і Н.Д. Снежкай (старэйшай дачкой) | 1928, [сяр. 1930-х гг., не пазней 1935] | 2 | 2 | |
| 31 | Фатаграфіі Д.С. Снежкі ў групах: з таварышамі па службе, падчас агляду пацыента, з калегамі па Тульскай абласной дзяржсанінспекцыі (на адвароце дароўны надпіс ад калег) і санаторыю "Усць-Качка" (Молатаўская [Пермская] вобласць) (на адвароце дароўны надпіс ад калег).<br>Лл. 2 і 3 - М.Я. Снежка (жонка) [1920-я гг.] | 1931-1953 | 6 | 6 | |
| | *** | | | | |
| 32 | Фатаграфіі Сямёна Дзям'янавіча Снежкі (бацькі) (на адвароце пячаткі: "Фотографія Б. Шляпоберскаго г. Орша" і "Печать Оршанскаго у зда пристава 2го стана"); Нінэлі Дзмітрыеўны і Эміліі Дзмітрыеўны Снежкаў (дачок) (на адвароце дароўны надпіс Н.Д. Снежкі Ніне Яўсееўне [Севяр'янавай] (швагерцы Д.С. Снежкі) | 1896, 1937 | 3 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 33 | Фатаграфія помніка на магіле Д.С. Снежкі | [2008-2013] | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 34 | Фатаграфіі Вікенція Ігнатавіча Смідовіча [1890-1894]. Копіі з арыгіналу, падпісанага 30 верасня 1940 г. Вікенціем Вікенцьевічам Верасаевым (сынам В.І. Смідовіча, пісьменнікам) | | 3 | 3 | |

У дадзены вопіс унесена 34 (трыццаць чатыры)
справы з № 1 па № 34 , 153 дакументы.

Вопіс склаў і апрацоўку
фонда зрабіў

вяд. архівіст ______________________ А.У. Адліванчык

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.